# МАСТАЦКАЕ ВЫРАШЭННЕ ТЭМЫ Ў АПАВЯДАННІ АНАТОЛЯ КРЭЙДЗІЧА «МУРАШНІК»

***Н. В. Кузьміч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*kuzmich_nv@mail.ru*

У матэрыяле разглядаюцца асаблівасці выкарыстання супастаўлення і градацыі ў апавяданні «Мурашнік» сучаснага беларускага пісьменніка Анатоля Крэйдзіча.

***Ключавыя словы:*** апавяданне; супастаўленне; градацыя; Анатоль Крэйдзіч.

# ARTISTIC SOLUTION TO THE THEME IN ANATOL KREIDZICH'S STORY «ANTHILL»

***N. V. Kuzmich***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvaryjskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: N. V. Kuzmich (kuzmich_nv@mail.ru)*

The material examines the features of the use of comparison and gradation in the story of the modern Belarusian writer Anatoly Kreidzich «Anthill».

***Key words:*** story; comparison; gradation; Anatol Kreidzich.

Тэма апавядання «Мурашнік» сучаснага беларускага пісьменніка Анатоля Крэйдзіча закранае глабальнае пытанне суадносін свету чалавека і свету прыроды. Для мастацкага вырашэння тэмы аўтар выкарыстоўвае прыёмы супастаўлення і градацыі.

Чалавек (так называецца герой апавядання) некалькі разоў у тэксце сустракаецца з мурашнікам. Паміж першай і наступнымі сустрэчамі праходзіць час, герой пастунова мяняецца: спачатку гэта «чалавек», «чалавек у форменнай апратцы з дубовым лісцем на пятліцах», потым «стары з дубовым лісцем на пятліцах», «той самы чалавек, толькі па-

старэлы і ў цывільнай апратцы», проста «стары» і ўжо чалавек, «што насіў некалі вопратку з дубовым лісцем на пятліцах». Таксама мяняецца і мурашнік: спачатку ён закрывае, убірае ў сябе пень і дарожку побач, потым сваім конусападобным верхам дасягае ўжо па пояс чалавеку, пры апошняй сустрэчы мурашнік дарос чалавеку да плеч. На працягу твора мурашнік таксама некалькі разоў пацярпеў ад дзеянняў людзей, якія амаль што не разбурылі яго, і наступствы гэтага бачыць герой твора пры кожнай новай сустрэчы: спачатку на марашніку пакінуў адбітак кола веласіпед, потым – матацыкл, пасля – трактар.

Кожная новая сустрэча і ўбачанае выклікаюць новыя эмоцыі ў чалавека: спачатку «…ужо і не думаў і не гадаў, што мурашнік, які вырас ля самай лясной сцяжынкі, выжыве, адродзіцца», «неяк спачувальна ці то вінавата пасміхнуўся», потым «…ці то радаваўся, што яго папярэджанне было разумным, трапным, ці бедаваў? Але тое, што спачуваў мурашам, – гэта без сумненняў», затым «як узгледзеў яго, – знямеў. Больш ад здзіўлення …чым ад абурэння», нарэшце «праслязіўся, бо ўбачыў, што горка зноў здорава пацярпела». Таксама і дзеянні чалавека ў дачыненні да мурашніка падаюцца ў руху: «скрушна схіліў галаву», «прыпаў на адно калена, схіліўся», «схадзіў па сякеру, вырубіў і затачыў чатыры бярозавыя слупкі, убіў іх вакол мурашніка, пасля пакараваў восем танклявых альховых жардзінак, прыбіў да слупоў. Атрымалася агароджа», «…спахапіўся: «Ці варта зноў варушыць адбудаваную другім разам хату?» Пакінуў, як ёсць», затым «…моўчкі пастаяў, павярнуўся, цяжка ўздыхаючы, і паплёўся па сцежцы…».

Апавяданне мае кальцавую будову: у пачатку і ў канцы твора чалавек стаіць каля мурашніка. На працягу твора мяняецца знешні выгляд героя і пачуцці яго праходзяць своеасаблівую градацыю: калі ў пачатку чалавек абараняе мурашнік, то ў канцы апавядання гэты ж чалавек разбурае яго. Перамена ў паводзінах выяўляе зрухі ў самаацэнках: «Стары падумаў, што мурашы сваёю абыякавасцю і да зла, і да дабра, якія чыніць ім чалавек, дэманструюць сваю пагарду да апошняга. І ён размахнуўся сваім пружыністым моцным кіем, які змайстраваў сабе са ствала старога ядлоўцу і без якога ўжо не здужаў хадзіць, і апусціў яго на маленькіх ганарліўцаў, што мітусіліся пад нагамі. Некалькі мурашоў брыкнулі на спіну, патузаліся, паварушылі лапкамі, перавярнуліся, знайшлі кожны свой груз і, нібыта нічога не здарылася, заспяшаліся да свайго жытла». Атрымліваецца, што чалавек, які кожны раз спачувае мурашам, пры апошняй сустрэчы з імі сам апускае зроблены для сябе ж кій на тых,

каго да гэтага моманту шкадаваў. Мурашы аказаліся мацней за чалавека, які не змог змірыцца з пастаянным імкненнем – нягледзячы ні на што, адрадзіць сваё жытло-краіну.

Прыём градацыі нясе глыбокае змястоўна-сэнсавае значэнне. У градацыі паказаны пачуцці чалавека: шкадаванне, здзіўленне, злосць. Прыём градацыі падкрэслівае сувязі чалавека і народа, супастаўленне толькі сімвалічна разлучае іх. Як вынікае з ідэйнай задумы, чалавек і народ заўсёды разам, у спосабах дзеяння яны не могуць увасобіць свой лёс асобна. На аснове супастаўлення чалавека і мураша можна гаварыць пра праекцыю на больш аб'ёмныя вобразы чалавецтва і прыроды. У выніку алегорыя апавядання, заснаваная на такім мастацкім падыходзе, дае магчымасць дакладна расставіць маральна-духоўныя акцэнты. Таксама можна гаварыць, што аўтар робіць спробу стварэння ўласнага міфа, які служыць мастацка-эстэтычным прыёмам у вырашэнні творчай задачы, што адначасова з'яўляецца і адметнай рысай індывідуальнага стылю пісьменніка.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Крэйдзіч А.* Палескі Напалеон: Аповесць, апавяданні / А. Крэйдзіч: Прадм. А. Казлова. Мн.: Маст. літ., 2001. 223 с. (Дэбют).